*Л.Ф.Голікава*

# Кампазітары беларускага замежжа: з гісторыі нацыянальнай эміграцыі

Без знаёмства з творчасцю вядомых на Захадзе беларускіх кампазітараў-эмігрантаў — М.Равенскага, М.Куліковіча-Шчаглова, Э.Зубковіч, А.Карповіча і іншых, якія "застануцца ўзорным прыкладам ахвярнасці і шчырай аданасці як мастацтву і навуковай праўдзе, так і свайму народу" [1], нельга ўявіць карціну развіцця нацыянальнай музычнай культуры ў цэлым. Побач з названымі працавалі менш вядомыя кампазітары (К.Кіслы, В.Селях-Качанскі, Д.Верасаў, Х.Барысавец, П.Звонны), а таксама шэраг таленавітых аматараў. Нягледзячы на розны ўзровень іх прафесійнага майстэрства, практычна ўсе яны ўносілі свой уклад у шанаванне беларускай нацыянальнай музыкі. Так, Кастусь Кіслы (1898—1985) — дырыжор і фальклярыст, кампазітар — быў добра вядомы шырокаму колу прафесійных музыкантаў і аматараў як стваральнік царкоўнай музыкі і знаўца беларускай народнай песні. Да ад'езду на Захад ён працаваў хормайстрам у Беластоку, а пасля смерці М.Равенскага ў 1953 г. замяніў яго ў якасці рэгента і кіраўніка мужчынскага хору ў Лювене (Бельгія). Пазней (з 1956 г.) К.Кіслы займаўся з харыстамі і інструменталістамі Канады і ЗША.

Творчая спадчына кампазітара прадстаўлена ў асноўным царкоўнымі творамі. Сярод іх выдадзеныя ў Кліўлендзе (ЗША) у 1957 — 1963 гг. зборнік падляшскіх велікодных і іншых напеваў, шэсць зборнікаў літургічных і паралітургічных твораў, старажытных царкоўных песнапенняў рэгіянальнага (мясцовага) паходжання, у якіх выразна адчуваюцца сувязі з фальклорнымі вытокамі, мілагучнасцю і лірычнасцю беларускай народнай песні.

Сярод стваральнікаў царкоўнай музыкі і ўвогуле сярод музыкантаў, якіх можна аднесці да беларускай школы царкоўных кампазітараў (М.Анцаў, М.Равенскі, А.Туранкоў, М.Куліковіч-Шчаглоў, А.Валынчык), неабходна назваць і імя Вячаслава Селяха-Качанскага (1885—1976) — вядомага спевака (бас-барытон), ветэрана нацыянальнай опернай сцэны, рэжысёра і дырыжора. У сярэдзіне 20-х гг. В.Селях — тады яшчэ прафесар Беларускага музычнага тэхнікума, папулярны ў Мінску вакаліст — выступае на сцэне і на канцэртнай эстрадзе. Аб адным з такіх выступленняў вядомага спевака, якое адбылося ў клубе імя К.Маркса на балетным вечары Ніжынскай і Ганчарова пад інтрыгуючай назвай “Паказальнае самаахвяраванне!”, паведаміў тагачасны часопіс “Трыбуна мастацтва”. Па словах карэспандэнта, балетныя нумары “былі асяджаны (так у тэксце. — *Л.Г.*) скрыпкай Бяссмертнага і спевамі Селяха” [2]. Ён прымаў таксама актыўны ўдзел у гістарычных камерных вечарах, якія рэгулярна арганізоўваліся ў музычным тэхнікуме, вёў секцыю пастаноўкі голасу ў гуртку самадзейнасці пры БДТ-1.

В.Селях, як і Ю.Дрэйзін, — адзін з актыўных прыхільнікаў стварэння нацыянальнай беларускай оперы і нават выступаў у дыскусіі на гэтую тэму на старонках “Трыбуны мастацтва”. Менавіта ён арганізаваў у 1927 г. разам з кампазітарам-хормайстрам А.Ягоравым, які неаднойчы кіраваў этнаграфічнымі экспедыцыямі супрацоўнікаў Інстытута мастацтваў, Беларускую харавую капэлу.

На Захадзе В.Селях узначальваў групу таленавітых спевакоў (жаночы хор “Каліна”) і дырыжораў з супольнасці Саўт-Рыверы (ЗША). Пад рэдакцыяй В.Селяха-Качанскага апублікаваны зборнік “Спеўнік беларускіх салдатаў” (1975). На жаль, засталіся неапублікаванымі некаторыя музычныя тэксты і спеўнікі, у якія ўваходзіла царкоўная музыка В.Селяха.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод вядомых на Захадзе кампазітараў, педагогаў і музыказнаўцаў даволі папулярнае імя прафесара Эльзы Зубковіч. Яна нарадзілася ў Мінску ў 1895 г. Э.Зубковіч атрымала добрую еўрапейскую адукацыю як піяністка. Яна вучылася ў прафесара Варшаўскай кансерваторыі Георга Жураўлёва, а потым удасканальвала сваё майстэрства ў Берліне і Штутгарце. У 1922 г. яна вяртаецца ў Беларусь і пачынае педагагічную працу ў якасці выкладчыка музыкі ў школе, затым у музычным тэхнікуме ў Мінску. З 1932 г. Э.Зубковіч выкладала ў кансерваторыі.

На Захадзе яна вядомая як аўтар пераважна вакальнай музыкі, рамансаў і песень на вершы беларускіх паэтаў: "Дарога" на словы Я.Коласа, "Вясна ў няволі" на словы А.Гаруна, "Прыгажосць Беларусі" на словы М.Кавыля і інш. Вакальныя творы кампазітара вылучаюцца пяшчотнасцю мелодыкі, напеўнасцю, інтанацыйна блізкай да лірычнай беларускай народнай песні. Поспехам карыстаўся зборнік Э.Зубковіч "Край мой васільковы", выдадзены ў Нью-Йорку ў 1972 г., у які ўвайшлі дванаццаць песень для сярэдняга голасу з фартэпіяна, амаль кожная з якіх прысвечана Беларусі.

У творчую спадчыну аўтара ўваходзяць таксама некалькі п'ес для фартэпіяна і фартэпіянная фантазія на тэму беларускай песні "Бульба". Для пачынаючых піяністаў Э.Зубковіч напісала падручнік "Першыя радасці". Яна неаднойчы выступала ў так званых беларускіх канцэртах ў Нью-Йорку ў якасці канцэртмайстра сваёй дачкі, Л.Маркоўскай, вядомай спявачкі (меццa-сапрана). Займалася таксама рэдактарскай дзейнасцю: сумесна з этнографам А.Евецам працавала над рэдагаваннем зборніка беларускіх народных песень "Дудар", у які ўвайшлі абрадавыя (калядныя, купальскія, веснавыя) і бытавыя (вайсковыя, маладзёжныя, жартаўлівыя, дзіцячыя і інш.) песенныя творы з тэкстамі, часам аднагалосыя і з некалькімі варыянтамі мелодый.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод прадстаўнікоў беларускай музычнай эміграцыі шырокую вядомасць на Захадзе набыло імя кампазітара і тэарэтыка-крытыка Алеся Карповіча (1909—1992), ураджэнца в.Азёркі Гродзенскай вобласці. Былы сябра М.Равенскага, А.Карповіч у даваенны перыяд скончыў гісторыка-тэарэтычны факультэт Маскоўскай кансерваторыі па класе прафесара І.Спасобіна. З 1938 г. ён працаваў у Мінску ў кансерваторыі, займаўся кампазітарскай і крытычнай дзейнасцю. Кола яго навуковых інтарэсаў даволі шырокае. Шмат публікацый прысвечана творчасці заходнееўрапейскіх і рускіх кампазітараў, у тым ліку артыкулы “Жорж Бізэ”, “9 сімфонія Бетховена”, “Яўгеній Анегін” і іншыя, а таксама беларускай музыцы («Опера “Кветка шчасця”», “Старэйшы беларускі кампазітар: А.Я.Туранкоў”, “Анатолий Богатырев”.

У гады вайны А.Карповіч, знаходзячыся ў Мінску, выступіў у друку з артыкулам, у якім прааналізаваў оперу М.Шчаглова “Лясное возера”. З 1944 г. кампазітар пераязджае на Захад, дзе працягвае выступаць з публікацыямі, прысвечанымі творчаму лёсу і творчасці беларускіх кампазітараў-эмігрантаў (М.Равенскаму, М.Куліковічу, Э.Зубковіч), а таксама праблеме ўвасаблення беларускага нацыянальнага стылю ў музыцы. Некаторы час ён дапамагаў К.Кісламу як піяніст-акампаніятар кіраваць хорам пасля смерці М.Равенскага.

Менавіта на Захадзе пачынаецца кампазітарская дзейнасць А.Карповіча. Яго творчасць ў асноўным абмежавана жанрамі фартэпіяннай камерна-інструментальнай і камерна-вакальнай музыкі. Найбольш вядомымі фартэпіяннымі творамі кампазітара можна назваць Беларускую сюіту, “Янку-польку”, Беларускія рапсодыі. Вакальная музыка прадстаўлена рамансамі на словы беларускіх паэтаў Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, Ф.Багушэвіча, Л.Геніюш, Н.Арсеньевай [3], С.Ясеня, а таксама апра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цоўкамі беларускіх народных песень. На жаль, не ўсе творы А.Карповіча апублікаваны, частка спеўнікаў захавалася ў рукапісах.

Як і іншыя кампазітары яго пакалення, А.Карповіч прытрымліваўся "фальклорнага кірунку" ў творчасці, цікавасць да якога можна часткова растлумачыць эмігранцкім лёсам музыканта, а часткова тым, што менавіта фальклор станавіўся асновай, творчым імпульсам для аўтара. Не выпадкова і ў сваіх рэцэнзіях, якія А.Карповіч рэгулярна публікуе ў беларускамоўнай замежнай прэсе (напрыклад, у "Запісах", якія выходзяць у ЗША з 1952 г.), ён аддае перавагу рэцэнзаванню выданняў зборнікаў народных песень і харавых апрацовак народных песень.

Трэба адзначыць, што Злучаныя Штаты Амерыкі ў другой палове XX ст. становяцца "другой радзімай" амаль для усіх вышэйназваных кампазітараў-эмігрантаў беларускага паходжання, хаця, як вядома, да сярэдзіны XX ст. найбольш значныя сілы беларускай музычнай эміграцыі канцэнтраваліся ў Італіі, Францыі, Германіі, Аргенціне. Так, у снежні 1934 г. у Буэнас-Айрэсе (Аргенціна) пачынае дзейнічаць першае беларускае культурна-асветнае таварыства «Грамада», а ў студзені 1937 г. узнікае беларускае таварыства «Культура», у якое ўваходзілі 180 чалавек на чале з Вінцэнтам Крукоўскім. Культурная справа таварыства была даволі разнастайнай і ўключала таксама і выступленні перад публікай. У арганізацыі быў створаны тэатральны гурток, які з поспехам паказаў невялічкія камедыйныя п'есы ("Мікітаў лапаць" і "Птушка шчасця"). Разам з тэатральным карысталіся папулярнасцю музычны (пад кіраўніцтвам Язэпа Ангулі) і танцавальны (кіраўнік Юрка Ежук) гурткі. У 1949 г. асацыяцыя беларусаў у Буэнас-Айрэсе арганізавала змешаны хор пад кіраўніцтвам

дырыжора І.Гейгроха. Дзейнічаў музычны калектыў беларусаў (дырыжор М.Бурнос) і ў Аўстраліі.

Трэба адзначыць, што свайго роду канцэртнымі пляцоўкамі для творчых эксперыментаў і практычнай дзейнасці кампазітараў у эміграцыі сталі беларускія арганізацыі моладзі, пераважна скаўцкія, у якіх ствараліся харавыя калектывы, распаўсюджваліся спеўнікі, складзеныя з твораў на беларускай мове. У рэпертуар такіх калектываў былі ўключаны скаўцкія (“Скаўцкая малітва”, “Заўсёды”, “Сям’ёй вясёлай” М.Равенскага) і патрыятычныя (песня кавалерыйскага эскадрона абароны Навагрудка “Раздзёрты сваркамі народ”) песні, фальклорныя творы і рэлігійныя канты, а таксама аўтарская музыка М.Равенскага, М.Куліковіча-Шчаглова і інш.

Значэнне творчасці кампазітараў беларускага замежжа “як крыніцы беларускай музычнай культуры” [4] надзвычай вялікае. Без уключэння іх аўтарскай музыкі ў агульны працэс развіцця нацыянальнага музычнага мастацтва значна збядняе апошняе, а ігнараванне асобных сачыненняў (напрыклад, опер ці твораў царкоўнай музыкі) пакідае белыя плямы у агульнай творчай спадчыне айчынных кампазітараў. Як слушна адзначае сучасны даследчык, “бессэнсоўна ... вывучаць гісторыю Беларусі без гісторыі беларусаў у свеце <...> не ўлічваць уклад беларусаў у культуру” [5] іншых краін і сваю, бо без духоўных здабыткаў творчасці айчынных і “замежных” беларускіх творцаў немагчыма праўдзівая, аб’ектыўная і цэласная гісторыя нацыянальнай культуры.

---

*1. Прадмова* да № 1 “Запісаў” (цыт. па: Мамонька У. Праблемы культуры і мастацтва ў “Запісах”// Культура беларускага замежжа / Пад рэд. А.Сабалеўскага. — Мн., 1993. — Кн. 1. — С. 107).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Вечар* балета // Трыбуна мастацтва. — 1925. — № 1. — С. 11.

3. *Выдатная* паэтэса беларускага замежжа, якую называлі "паэткай восені" за тое, што "вобраз восені ... стаўся для яе найбліжэйшым, найулюбёнейшым, найінтымней зробленым канкрэтным увасабленнем вобраза ... прыроды" (*Мішчанчук М.* Між берагамі (Лёс і творчасць Наталлі Арсенневай) // Культура беларускага замежжа / Пад рэд. А.Сабалеўскага. — Мн., 1993. — Кн. 1. — С. 18.

4. *Пікарда Г.* Беларускія эміграцыйныя спеўнікі і вакальныя партытуры (1944—1994) // Беларусіка = Albaruthenica. Кн. 5. Культура беларускага замежжа; Беларуска-амерыканскія гістарычна-культурныя ўзаемадачыненні / Рэд. У.Конан, А.Мальдзіс. — Мн., 1995. — С.61. Цікава адзначыць, што Гай дэ Пікарда, брэтонец па паходжанні, адвакат, з'яўляецца выдатным знаўцам і аматарам беларускай музыкі, з якой пазнаёміўся дзякуючы рускім духоўным творам П.Чайкоўскага і А.Грачанінава. У часы вучобы ва універсітэце ў Парыжы Г.Пікарда спяваў у царкоўным праваслаўным хоры, а па суботах слухаў украінскую духоўную музыку грэка-каталіцкай традыцыі. У бытнасць студэнтам Оксфардскага універсітэта ў Лондане ён быў сакратаром англа-савецкага таварыства, арганізаваў канцэрт, дзе гучалі ўкраінскія, рускія і беларускія песні. Даведаўшыся пра беларускі студэнцкі хор у Лювене пад кіраўніцтвам М.Равенскага, зацікавіўся іх беларускім рэпертуарам. У 1959 г. адправіўся ў Кіеў для пошукаў старажытнай беларускай царкоўнай музыкі. Менавіта там Г.Пікарда быў знойдзены Супрасльскі ірмалагіён XVI ст.

5. *Грыцкевіч В.* Як пераадолець адставанне гістарычнай навукі Беларусі // Беларусіка = Albaruthenica. Кн. 1. / Рэд. А.Мальдзіс і інш. — Мн., 1993. — С. 103.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ